Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЖНІЎНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 149 (28259)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Сваё месца на рынку
СТАР. 4



Ад дыджэя да кіраўніка
СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень
20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сёння ёсць неабходнасць гаварыць аб удасканаленні нормаў, накіраваных на папярэджанне п'янства і алкагалізму, у тым ліку і аб праблеме даступнасці алкаголю на прылаўках гандлёвых аб'ектаў. Пытанне рэалізацыі алкаголю ў кругласутачных магазінах, на АЗС, у іншых гандлёвых аб'ектах будзе дадаткова разгледжана. Сёння бачым, што ў розных ведамстваў няма адзінага пункту гледжання на гэтае пытанне. Пра гэта трэба гаварыць, бо, нягледзячы на зніжэнне ўжывання алкаголю, праблема застаецца актуальнай».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9926 | ▼ |
| Еўра | 2,2191 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0300 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0803 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# ТОЛЬКІ НЕБА І ТЫ



Фота БЕЛТА.

У Гродзенскім аэраклубе кожны ахвотны можа праверыць сябе на смеласць.

■ Бліжэй да людзей

## І ДАРАДЦЫ — ТАКСАМА

### Ці можа паштальён прымаць аплату за паслугі ЖКГ?

**У Петрыкаўскі раённы вузел паштовай сувязі мы з'явіліся пасля дзевяці гадзін раніцы, калі ў рэйс адпраўлялася машына з грузам. А менавіта: перыядычнымі выданнямі, пісьмамі, пасылкамі, рознай карэспандэнцыяй, пенсіямі, таварамі шырокага ўжытку і г.д.**

— Наш маршрут, — заўважаюць **кіроўца Ігар ГАРОШКА** і **паштальён па суправаджэнні Сяргей КУЦЮРУБА**, — у Кашэвічы. Адлегласць няблізкая: туды і назад трэба пераадолець больш за 190 кіламетраў. У райцэнтр вернемся ў канцы рабочага дня, калі акажам людзям усе неабходныя паштовыя паслугі.



**Паштальён па суправаджэнні Сяргей КУЦЮРУБА *(злева)* з кіроўцам Ігарам ГАРОШКАМ гатовы адправіцца па маршруце Петрыкаў—Кашэвічы.**

Да размовы падключаецца **начальнік РВПС Валянціна ЯЎЛАШ**:

— Сёння, пачынаючы з васьмі гадзін, у падобныя рэйсы адправіліся ўжо пяць аўтамашын па маршрутах: Фаставічы, Колкі, Бабунічы, Брынёў, Мышанка. Гэта называецца мотадастаўка, якой абслугоўваюцца жыхары 64 вёсак і пасёлкаў, дзе няма аддзяленняў паштовай сувязі. Заўважу, што ўсяго ў раёне 125 населеных пунктаў, якія мы ахопліваем сваімі клопатамі. І яшчэ: мотадастаўка дзейнічае кожны дзень, акрамя, вядома, выхадных.

— Давайце, Валянціна Леанідаўна, удакладнім наступныя пытанні: ці могуць паштальёны па суправаджэнні прымаць ад насельніцтва аплату за паслугі ЖКГ і ці могуць яны выканаць заказ па дастаўцы таму ці іншаму чалавеку набытых пральнай машыны або халадзільніка?

— Сумненняў няма: могуць. І не толькі гэта. Яны прымаюць ад вяскоўцаў плацяжы за карыстанне газам, за паслугі электра- і сотавай сувязі, радыё, плацяжы ў бюджэт, задавальняюць просьбы па забеспячэнні іх таварамі шырокага ўжытку як харчовага, так і прамысловага кшталту. Вядуць падпіску на газеты. Што вельмі зручна для людзей, бо ім не трэба дабірацца да тых населеных пунктаў, дзе ёсць паштовыя аддзяленні.

СТАР. 3

■ Алімпійскі дзённік

## ЗА КРОК ДА СТАРТУ

### Сёння ноччу ў Бразіліі пройдзе цырымонія адкрыцця XXXI Алімпійскіх гульняў




**На стадыёне «Маракана» нарэшце запаліцца алімпійскі агонь, у Рыа-дэ-Жанэйра будзе яшчэ 5 жніўня, у Беларусі ўжо ноч 6-га.**

Факел з агнём быў запалены ў Грэцыі ў старажытнай Алімпіі 21 красавіка. А ўжо 3 мая прыбыў у сталіцу Бразіліі, дзе быў дадзены старт нацыянальнай эстафеце алімпійскага агню, факел пераадолеў 20 тысяч кіламетраў па зямлі і больш за 10 тысяч кіламетраў па паветры. Завершыцца эстафета на стадыёне «Маракана» падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця Гульняў.

Звычайна імя чалавека, які запаліць алімпійскі агонь, трымаецца ў таямніцы да апошняга моманту, але ў гэтым годзе ў грамадскасці ўжо ёсць некаторыя здагадкі. Легендарны бразільскі футбаліст Пеле паведаміў прадстаўнікам СМІ, што атрымаў падобнае запрашэнне ад кіраўніка МАК Томаса Баха. Калі ў Пеле атрымаецца перанесці запланаваную паездку за межы Бразіліі, ён застанецца ў Рыа-дэ-Жанэйра і запаліць агонь на стадыёне «Маракана».

СТАР. 13

# ПРАЦАВАЦЬ, УЗВАЖВАЮЧЫ КОЖНЫ КРОК

## Запатрабаваў Прэзідэнт, наведваючы прадпрыемствы Віцебскай вобласці

**У час наведвання Браслаўскага філіяла ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат» Аляксандру Лукашэнку далажылі аб выкананні яго даручэнняў аб аднаўленні, мадэрнізацыі і вывадзе на эфектыўны ўзровень работы прадпрыемства, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з дзейнасцю філіяла і тэхналагічным працэсам выпуску цвёрдых сыроў, а таксама з выстаўкай прадукцыі Глыбоцкага малочнакансервавага камбіната.

Як праінфармавалі Прэзідэнта, на прадпрыемстве ў 2011—2013 гадах рэалізаваны інвестыцыйны праект па рэканструкцыі, накіраваны на павелічэнне вытворчых магутнасцей па перапрацоўцы малака. Пасля рэканструкцыі філіял аснашчаны лініямі па выпуску цвёрдых сыроў прадукцыйнасцю 10 т у суткі і мяккіх сыроў метадам сепарыравання прадукцыйнасцю 2 т у суткі. Унікальнасць тэхналогіі заключаецца ў тым, што ўвесь працэс вытворчасці сыру закрыты і аўтаматызаваны. Высокая якасць прадукцыі дасягаецца за кошт строгага кантролю па ўсім тэхналагічным ланцужку вытворчасці, пачынаючы ад прыёмкі малака і заканчваючы выспяваннем сыру.

Вынікам праведзенай мадэрнізацыі стала павелічэнне вытворчых магутнасцей філіяла і пашырэнне асартыменту сыроў расійскай і галандскай груп з 12 да 38. Удзельная вага экспартных паставак у агульным аб'ёме рэалізацыі прадукцыі на прадпрыемстве складае амаль 90 працэнтаў.

У ходзе наведвання сельскагаспадарчага вытворчага кааператыву «Маяк Браслаўскі» Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў дакладна вызначыцца са спецыялізацыяй выпуску сельгаспрадукцыі ў кожным раёне Віцебскай вобласці.

Адразу пасля прыезду на сельгаспрадпрыемства ён падзяліўся ўражаннямі ад убачанага з борта верталёта ў ходзе рабочай паездкі ў Віцебскую вобласць. «Паглядзеў — не ўражаны ўбачаным у Браслаўскім раёне. Багатай Віцебская вобласць не будзе, калі будзем так працаваць», — сказаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ні ў якім разе нельга запускаць тэрыторыі, усюды павінен быць парадак. Пры гэтым ён акцэнтаваў увагу, што ў кожным раёне патрэбна свая спецыялізацыя з улікам прыродных умоў і зямель.

«Асноўная мэта маёй паездкі — не ўборка», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што тэхнікі ў гаспадарках хапае, уборачная кампанія ідзе сваім ходам. «Мяне хвалюе іншае, цікавяць тэхналогіі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы павінны былі тут, на паўночным захадзе краіны, перабудаваць тэхналогіі пад новыя севазвароты».

Пры гэтым ён заўважыў, што, безумоўна, цяжкавата працаваць у гэтым рэгіёне так, як, напрыклад, у Брэсцкай вобласці. Паводле яго слоў, трэба дакладна ўлічваць асаблівасці раёнаў і фарміраваць севазварот такім чынам, каб атрымліваць максімальна эфектыўны рэзультат ад сельгасвытворчасці. «Калі выпуск малака, мяса рэнтабельны, то менавіта на гэта і трэба арыентавацца і прыстасоўваць севазварот пад гэта», — сказаў ён.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы перасцярог ад бяздумнага падыходу. Трэба ўсё добра ўзважваць і падлічваць, перш чым прымаць рашэнні. «Трэба выходзіць на нармальныя севазвароты і пад гэта купляць адпаведную тэхніку», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама зрабіў акцэнт на тое, што прымяняльныя тэхналогіі, безумоўна, павінны быць добрымі, менавіта з улікам прыродных асаблівасцей кожнага раёна. «Не хачу даваць рэкамендацыі, бо што ні раён, то свая спецыфіка і, галоўнае, свая спецыялізацыя. Адсюль — севазварот, тэхніка», — сказаў ён.

Дакладнае патрабаванне Прэзідэнта — усё павінна прапрацоўвацца і ўлічвацца пад высокі рэзултат у аграрным сектары.

# НА КАРЫСЦЬ ЛЮДЗЕЙ

**У час паездкі па Віцебскай вобласці на сустрэчах з працоўнымі калектывамі Аляксандр Лукашэнка зрабіў шэраг заяў па актуальных пытаннях жыцця краіны. У прыватнасці, Прэзідэнт падзяліўся сваімі думкамі пра...**

## ...выбарчую кампанію

Прадстаўнікі СМІ пацікавіліся ў кіраўніка дзяржавы, чаго ён чакае ад кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, а таксама як ацэньвае дзейнасць парламента. «Аб станоўчым у дзейнасці нашага парламента я нядаўна гаварыў у Пасланні беларускаму народу і парламенту. Тады я выказаў удзячнасць дэпутатам, якія працавалі апошнія чатыры гады», — нагадаў Прэзідэнт. Ён таксама выказаў меркаванне, што «найлепшая якасць нашага парламента, што там працуюць прафесіянальна, спакойна, без крыкаў».

Парламент — гэта людзі, якія павінны ствараць законы, што прадугледжвае пэўную падрыхтоўку, сплаў ведаў і вопыту, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Я ведаю аб гэтым, таму што працаваў там сам на працягу чатырох гадоў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, нашы дэпутаты паспяхова працуюць і займаюцца заканатворчай дзейнасцю. «Паглядзіце, што адбываецца вакол, у іншых краінах. То бойку ў парламенце пачалі, то мардабоем займаюцца, то палітызацыя нейкая, то нейкія алігархі свае групы паставалі, нехта за грошы прыйшоў у парламент», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён заявіў, што ў Беларусі нічога такога няма. «Я вам з адказнасцю аб гэтым заяўляю, ніхто за грошы, ніякія багатыя людзі сваіх дэпутатаў не прапхнуць у парламент. Такога яшчэ не было і, напэўна, не будзе. У гэтым найлепшая якасць і дасягненне нашага парламентарызму наогул і нашага парламента», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Наш дэпутацкі корпус вельмі прыбліжаны да свайго выбаршчыка — да тых, хто за іх галасаваў. У гэтым каласальная перавага нашага парламента», — перакананы Прэзідэнт. Ён прадоўжыў: «Выбарчая кампанія ідзе спакойна. Скончыўся перыяд вылучэння кандыдатаў, ідзе рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты і тое, што ўжо больш як 6 чалавек прэтэндуе на адно дэпутацкае месца, — гэта добры паказчык, я толькі рады. Значыць, канкурэнцыя будзе забяспечана».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што неабходна ў поўнай меры задзейнічаць патэнцыял тых дэпутатаў, якія не пройдуць у новы склад парламента, і паабяцаў, што яны ўсе, пры іх жаданні, будуць працаўладкаваны.

## ...сітуацыю вакол БелАЭС

«Сустракаючыся нядаўна з паслом Літвы, я яму сказаў наступнае: «Давайце спынім гэту цягамоціну, давайце не будзем наступаць адзін на аднаго: вы будзеце на нас, а мы будзем адбівацца — па будаўніцтве атамнай станцыі. Давайце зробім яе сумесна ў плане таго (у іх сёння дэфіцыт электрычнасці), што мы будзем па нармальных, прымальных цэнах пастаўляць вам электрычнасць. Мы забіраем сёння людзей, якія на Ігналінскай станцыі засталіся без работы (станцыю закрылі). Мы прыцягнем гэтых людзей для работы ў нас. Яны будуць для нас не чужыя людзі. Гэта значыць шмат праблем, давайце будзем разам думаць, як эксплуатаваць гэту станцыю, а не стаяць лоб у лоб і адзін на аднаго паказваць пальцам», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, спекуляцыя вакол будаўніцтва БелАЭС — звычайная канкурэнцыя, палітызацыя (асабліва напярэдадні выбараў) і балбатня. «Вось нядаўна на Ігналінскай станцыі адбыўся пажар. Многія нават не ведаюць аб гэтым. Чаму? Мы не робім з гэтага катастрофы. Калі патрэбна дапамога, мы дапаможам. Але яны спраўляюцца самі з гэтым інцыдэнтам, больш сур'ёзным, чым у нас. Мы не крычым аб гэтым гвалтам», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуў увагу, што Беларусь і Літва павінны працаваць над тым, як зрабіць БелАЭС сумеснай станцыяй, каб яна прыносіла карысць абедзвюм дзяржавам. «Мы да гэтага гатовы, і такія прапановы я накіраваў кіраўніцтву Літвы», — заявіў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы таксама заўважыў, што апошнім часам у сродках масавай інфармацыі Літвы з'явілася разумныя разважанні спецыялістаў пра будаўніцтва атамнай станцыі ў Беларусі. У іх эксперты заяўляюць, што Беларусь больш, чым хто-небудзь, зацікаўлена ў бяспецы АЭС. Спецыялісты заклікаюць краіны да супрацоўніцтва ў гэтым напрамку. «Калі вы заклапочаны — знайдзіце ў сябе не палітыка, а групу прафесіяналаў у Літве, Латвіі, Польшчы і скажыце, што яны хочуць атрымліваць інфармацыю для ўсёй Літвы, Латвіі або Польшчы — мы будзем з імі працаваць, у нас жа сакрэтаў няма. Нават добра будзе, калі нехта збоку будзе больш пільна ўглядацца ў будаўніцтва атамнай станцыі ў нас у Беларусі. Мы ў гэтым вельмі зацікаўлены», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў, што Беларусь адмовіцца ад корпуса рэактара, які ўпаў пры будаўніцтве БелАЭС, нават калі ў яго ёсць хоць самае нязначнае пашкоджанне. «Некаторыя дапісаліся, і нават расіяне (больш за ўсё расійскія сродкі масавай інфармацыі) — «упаў рэактар на будуемай атамнай станцыі ў Беларусі». Ды прачніцеся: там ніякага рэактара яшчэ і няма, там ёсць металічны корпус — «бочка» — таўшчынёй 20 см, у які будзе змешчаны рэактар, — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мне далажылі раніцай, калі гэты інцыдэнт адбыўся. Будаўнікі перамяшчалі яго на складзе, трэніраваліся падымаць. Яго паднялі на мой рост, можа, крыху вышэй, стропы не вытрымалі, і гэта «бочка» адным краем упала на зямлю, з якой яе паднялі».

Прэзідэнт адзначыў, што яму прадставілі кадры гэтага інцыдэнту і ён адразу ж даручыў неадкладна разабрацца са здарэннем. «Нават калі ёсць нязначныя пашкоджанні або драпіны, мы ад гэтага корпуса павінны адмовіцца. І расіяне гавораць, што калі беларусы адмовяцца ад гэтага корпуса, то яны прывязуць іншы і ўстановяць. Вось і ўвесь інцыдэнт», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь як постчарнобыльская рэспубліка перш за ўсё зацікаўлена ў тым, каб атамная станцыя была бяспечнай. «Я асабіста кантралюю ход будаўніцтва гэтай станцыі, не гаворачы ўжо аб нейкіх інцыдэнтах. Калі б там фундамент заклалі і кусок сцяны абваліўся, напэўна, таксама было б гвалту на ўвесь свет», — дадаў беларускі лідар.

Паводле слоў Прэзідэнта, у бяспецы Беларускай АЭС зацікаўлена і Расія. «Яна будуе мноства станцый па ўсім свеце: у Турцыі, Егіпце збіраюцца пабудаваць, у Іране і Кітаі будуюць, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Не дай бог нешта здарыцца — да іх жа ніхто не прыйдзе і не закажа больш, яны страцяць вялікі шматмільярдны сектар сваёй эканомікі».

## ...неабходнасць далейшага развіцця аграэкатурызму ў краіне

Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што турыстычны бізнес, у тым ліку аграэкатурызм, неабходна больш актыўна развіваць. Ён прыслухаўся да прапаноў спецыялістаў у гэтай сферы і сказаў, што варта канкрэтна абмеркаваць гэтыя праблемы. «Уносьце прапановы, можа быць, сапраўды ўсё забюракратызавана і трэба разнявольваць», — дадаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён успомніў пра той перыяд пачатку прэзідэнцкай дзейнасці, калі трэба было яго ўмяшанне, каб спыніць дзялбу прынадных прыродных куточкаў.

«Тады мною было прынята жорсткае рашэнне — захаваць усё для людзей», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. У выніку ў краіне былі створаны нацыянальныя паркі, прыродныя багацці якіх могуць любавацца ўсе жыхары краіны. Прэзідэнт падкрэсліў, што на сучасным этапе развіцця аграэкатурызму неабходна, напэўна, вярнуцца да гэтага пытання і ўважліва паглядзець, што можна яшчэ зрабіць для развіцця дадзенага кірунку. Пры гэтым непахісным застаецца яго патрабаванне — да агульнанароднай прыроднай багаццяў павінны мець доступ усе людзі.

■ Нацбанк

# Стаўка рэфінансавання знізіцца

**Нацыянальны банк з 17 жніўня зніжае стаўку рэфінансавання з 20% да 18% гадавых і стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях Нацбанка па падтрымцы бягучай ліквіднасці банкаў з 25% да 23% гадавых. Такія рашэнні прынятыя Праўленнем і Камітэтам па манетарнай палітыцы Нацыянальнага банка Беларусі 3 жніўня, зыходзячы з аналізу дынамікі інфляцыйных працэсаў, стану плацежнага балансу і яго бягучага рахунку, сітуацыі на валютным і фінансавым рынках краіны.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка, у чэрвені бягучага года інфляцыя запаволілася да 12,1% у гадавым вырашэнні. Пры гэтым сярэднямесячны прырост спажывецкіх цэн у другім квартале гэтага года склаў 0,5% (у аналагічным перыядзе летась — 0,8%).

Дынаміка паказчыкаў структуры грашовай масы фарміруе ўмовы для далейшага зніжэння інфляцыі.

Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка адзначылі, што зафіксаванае ў першым паўгоддзі сёлета пашырэнне дэфіцыту рахунку бягучых аперацый плацежнага балансу было абумоўлена, перш за ўсё, пагаршэннем умоў гандлю энергетычнымі таварамі і падзеннем попыту на калійныя ўгнаенні. Пры гэтым у сферы знешнеэканамічнай дзейнасці, якая не залежыць ад кан'юнктурных фактараў, захоўваецца пазітыўны ўплыў мер эканамічнай карэкціроўкі.

Таксама з лютага гэтага года фарміруецца чыстая прапанова замежнай валюты на ўнутраным валютным рынку, у тым ліку ў сегменце прадпрыемстваў. Адбываецца паляпшэнне структуры дэпазітнага рынку, перш за ўсё, за кошт пераарыентацыі ўкладчыкаў на безадзыўныя дэпазіты з больш доўгімі тэрмінамі. Зніжэнне працэнтных ставак палепшыць здольнасць нефінансавых арганізацый да выканання крэдытных абавязацельстваў перад банкамі, што зменшыць рызыкі для фінансавай стабільнасці.

Магчымасці прыняцця далейшых рашэнняў Нацыянальным банкам у галіне працэнтнай палітыкі будуць вызначацца, згодна з прагнозамі стану плацежнага балансу і яго асобных складнікаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД АТРЫМАЎ АКРЭДЫТАЦЫЮ ПРЫ ЛАЦІНААМЕРЫКАНСКІМ ПАРЛАМЕНЦЕ

## Пра гэта паведаміла прэс-служба Палаты прадстаўнікоў

**Нацыянальны сход нашай краіны надае вялікае значэнне развіццю міжпарламенцкага дыялогу з краінамі Паўднёвай Амерыкі. Важным кірункам гэтай працы стала развіццё супрацоўніцтва з Лацінаамерыканскім парламентам — аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыяй, якая аб'ядноўвае заканадаўчыя органы 23 дзяржаў гэтага рэгіёна.**

Як праінфармавалі ў прэс-службе ніжняй палаты, у 2014 годзе Нацыянальны сход накіраваў зварот у Лацінаамерыканскі парламент з просьбай атрымаць статус пастаяннага назіральніка. «Па ўзгадненні бакоў у адпаведнасці са статутнымі дакументамі Лацінаамерыканскага парламента была ажыццёўлена сур'ёзная работа па юрыдычным афармленні адпаведнага статусу. Яе вынікам стала падпісанне 28 сакавіка бягучага года падчас афіцыйнага візіту ў Рэспубліку Беларусь парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Эквадор на чале са старшынёй Нацыянальнай асамблеі Эквадора, старшынёй Лацінаамерыканскага парламента Габрыэлай Рывадэнэйрай пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Лацінаамерыканскім парламентам», — гаворыцца ў прэс-паведамленні.

Нядаўна ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу нашай краіны прыйшоў ліст ад генеральнага сакратара Лацінаамерыканскага парламента, які пацвярджае, што Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь акрэдытаваны ў якасці пастаяннага назіральніка пры розных органах Лацінаамерыканскага парламента.

«Атрыманне ўказанага статусу адкрывае для Беларусі новыя магчымасці ўстанаўлення кантактаў з парламентамі — членамі гэтай арганізацыі, што дазволіць павысіць імідж нашай краіны на міжнароднай арэне», — інфармуе прэс-служба.

***Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаянай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу***, у размове з журналістамі паведаміў, што статус пастаяннага назіральніка пры Лацінаамерыканскім парламенце мае толькі Усекітайскі народны сход.

Па словах дэпутата, Беларусь ужо мае пэўныя эканамічныя напрацоўкі з Эквадорам, Кубай, Бразіліяй, Венесуэлай, Аргенцінай. Удзел у рабоце асамблеі Лацінаамерыканскага парламента дае магчымасць, падключыўшы дыпламатычныя каналы, напрамую весці перамовы з любым з кіраўнікоў парламентаў краін — членаў аб'яднання.

— Вельмі добры прыклад, які нас натхняе, — гэта Міжпарламенцкая асамблея АСЕАН, — адзначыў Віталь Бусько. У 2011 годзе Нацыянальны сход атрымаў пры ёй статус назіральніка, і да гэтага часу ўсе спікеры парламентаў краін — членаў АСЕАН ужо пабывалі ў Беларусі. Больш за тое, В'етнам — адзін з актыўных членаў гэтага аб'яднання — заключыў пагадненне аб зоне свабоднага гандлю з Еўразійскім эканамічным саюзам.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

■ Выбары-2016

# ШЛЯХ У ПАРЛАМЕНТ ДЛЯ МАЛАДЫХ

**Больш за 80% моладзі на пытанне «Ці будзеце вы галасаваць на выбарах?» адказваюць «Так, буду» ці «Хутчэй за ўсё буду». Такое даследаванне правяла Маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў пры Цэнтральным камітэце БРСМ. Меса юнакоў і дзяўчат у палітыцы абмеркавалі на анлайн-канферэнцыі БЕЛТА «Адкрыты дыялог «Моладзь і выбары: формула адказнасці».**

## Актыўныя наперадзе

Падчас даследавання было вызначана, што 64% маладых людзей цікавяцца палітыкай, 40% сочаць за палітычнымі навінамі, а больш за 50% робяць гэта час ад часу. «Гэта сведчыць аб тым, што моладзі сёння неабыякава, што адбываецца на палітычным полі, — упэўнены **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ**. — Саюз моладзі заўсёды быў дастаткова актыўным удзельнікам палітычных кампаній. На сёння 6 прадстаўнікоў БРСМ уключаны ў склад абласных і Мінскай гарадской выбарчых камісій, 90 чалавек — у склад акруговых камісій і 3500 членаў БРСМ — у склад участковых камісій. Па стане на 1 жніўня акрэдытавана 108 назіральнікаў. Мы плануем да 20 жніўня акрэдытаваць не менш за 5500 прадстаўнікоў БРСМ».

Удзельнікі дыскусіі абмеркавалі і ўзрост, з якога малады чалавек можа прыходзіць у парламент. Паводле Канстытуцыі, у Палату прадстаўнікоў магчыма быць абраным з 21 года, а ў Савет Рэспублікі — з 30 гадоў. Але не заўсёды ў такім маладым узросце чалавек можа прымаць узважаныя рашэнні. Часта ў гэтым дапамагае вопыт кіраўніка, які можна набыць толькі падчас работы.

— Актыўная моладзь жадае хутчэй прыйсці на кіруючыя пасады, у тым ліку ў парламент, — працягвае Андрэй Белякоў. — Рабіць стаўку толькі на старэйшае пакаленне — гэта няправільна. У моладзі, можа быць, не заўсёды ёсць дастаткова ведаў і вопыту, але ёсць энергія, жаданне працаваць і спасцігаць. Таму 21 год — тое, што вызначана Канстытуцыяй, — напэўна, рана. Але бліжэй да 30 гадоў, а гэта яшчэ малады ўзрост, чаму б не паспрабаваць? Наша задача — працаваць так, каб нашы ініцыятывы прыносілі карысць. Тады з цягам часу знойдуцца людзі, якія будуць годна прадстаўляць інтарэсы моладзі ў Нацыянальным сходзе. Тым больш што такі вопыт ёсць. У нас у кожным скліканні ёсць некалькі чалавек — прадстаўнікоў моладзі, у тым ліку БРСМ.

## Адкрыты для ўсіх

Праект «Адкрыты дыялог», ініцыятарам якога выступіў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, — гэта дыскусійная пляцоўка для грамадска-палітычнай актыўнасці. **Дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя» і палітычны аналітык Аляксандр ШПАКОЎСКІ** адзначыў пазітыўны бок гэтага праекта:

— Моладзь — адна з найбольш актыўных і адначасова адна з найбольш праблемных сацыяльных груп у любым грамадстве. Палітычная актыўнасць беларускай моладзі некалькі адрозніваецца ад палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат у шэрагу суседніх краін. Наша ў першую чаргу накіравана на стварэнне. Часам у некаторых з крытыкаў беларускай сацыяльнай мадэлі ўзнікаюць надзеі на так званую «змену пакаленняў». На тое, што прыйдуць новыя людзі і беларуская дзяржава будзе выглядаць інакш. Можа быць, не такой міралюбнай, не такой стабільнай, якой яна з'яўляецца цяпер. Пакуль вопытныя назіранні нават за бягучай парламенцкай кампаніяй паказваюць, што гэта не так. У Беларусі паміж рознымі пакаленнямі існуе паразуменне. І такія праекты, як «Адкрыты дыялог», у першую чаргу, накіраваны на тое, каб забяспечыць кантакт паміж рознымі грамадскімі групамі.

## Па дарозе з аднадумцамі

Удзельнікі дыскусіі абмеркавалі шлях, якім моладзь можа трапіць у палітыку. Адна з магчымасцяў — праз палітычныя партыі.

— Палітычныя партыі ў Беларусі, усе без выключэння, маюць вельмі нізкі рэйтынг, — заўважыў Аляксандр Шпакоўскі. — У гэтых умовах актыўнай палітыкі ў нас няма. Але не трэба блытаць актыўную палітыку з тым, што адбываецца ў некаторых нашых суседзяў. На мой погляд, яны занадта рана разышліся на ўсе заставы палітычнай барацьбы, забыўшыся пры гэтым пра неабходнасць станаўлення дзяржавы. Краіны з моцнай парламенцкай дэмакратыяй ішлі да гэтага сотні гадоў. Наша дзяржава вельмі маладая, я думаю, паступова — і ў грамадстве цяпер назіраецца запыт на такую актывізацыю палітычнага жыцця — і мы прыйдзем да адзінай палітычнай эліты па базавых каштоўнасцях. Яна будзе адзіная, па некаторых выключаных аспектах мы будзем дыскутаваць. У нас будзе развітая партыйная сістэма — яе контуры ўжо цяпер праглядаюцца.

«Шэраг грамадскіх аб'яднанняў, якія існуюць у Рэспубліцы Беларусь, маюць усе прыкметы палітычнай партыі, — дадаў палітолаг. — Справа за малым: за выразнай ідэалогіяй, палітычнай воляй і фармальным рашэннем. У першую чаргу я маю на ўвазе Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь». У многіх дзяржавах існуе партыя ўлады. Для постсавецкай прасторы гэта наогул агульнапрынятая формула. Для нашага асноўнага стратэгічнага партнёра Расійскай Федэрацыі — формула традыцыйная. Таму, я думаю, у нас рана ці позна такое рашэнне таксама будзе прынята. І для моладзі будзе структура, якая выконвае ролю сацыяльнага ліфта, якім і павінны быць палітычныя партыі. Маладыя чалавек з БРСМ потым будзе прыходзіць у «Белую Русь» і далей развівацца ў гэтым кірунку».

Аляксандр Шпакоўскі лічыць, што іншыя ідэалагічныя кірункі таксама могуць быць запоўненыя. Напрыклад, левы спектр палітычных партый дастаткова актыўна прадстаўлены Камуністычнай партыяй Беларусі, Рэспубліканскай партыяй працы і справядлівасці і Беларускай патрыятычнай партыяй. Гэтыя сілы выстаўляюць сваіх кандыдатаў на выбары. «Што датычыцца ліберальнага лагера: калі яны здолеюць граматна паліттэхналагічна перабудавацца, адаптавацца да новых рэалій, то могуць быць уключаны ў палітычны працэс. Яны таксама выказваюць інтарэсы пэўных людзей у нашай краіне», — выказаў сваю думку ўдзельнік «Адкрытага дыялога».

**Надзея АНІСОВІЧ**

■

# Час ідэй — час вызначацца




**Напярэдадні парламенцкіх выбараў у Гродне стартавала маладзёжная абласная акцыя «Час ідэй — час выбару». Яе мэта — зацікавіць маладых людзей актыўна ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі.**

Сімвалам акцыі стаў гадзіннік са стылізаванай «галачкай» і 13-значным цыферблатам. Гадзіннік, сімвал пастаяннага руху, адлічвае час, які застаўся да важнай палітычнай падзеі ў краіне. «Галачка» сімвалізуе выбар. А 13-значны цыферблат азначае колькасць ініцыятыў і ідэй, якія моладзь Гродзеншчыны адрасуе дэпутатам ад 13 акруг рэгіёна. Актывісты БРСМ раздадуць сімвал акцыі, дзе можна будзе напісаць прапановы для дэпутатаў, усім ахвотным.

Стартаваўшы з флэш-моба і канцэртных нумароў у выкананні пераможцаў творчых праектаў БРСМ на пляцоўцы каля маладзёжнага цэнтра ў Гродне, акцыя «Час ідэй — час выбару» з 5 жніўня па 9 верасня пройдзе ва ўсіх раёнах вобласці.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# І ДАРАДЦЫ — ТАКСАМА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спектр паслуг нашых работнікаў вельмі шырокі. Шлях іх у прафесію — самы разнастайны: у кожнага — свой. Людміла Зубар, напрыклад, закончыла сельгастэхнікум, але прызвання ў гэтай галіне гаспадарання не знайшла і ўжо 18 гадоў працуе ў нас. Яна — клапатлівая маці дваіх сыноў, у яе самы вялікі ўчастак абслугоўвання ў паштовым аддзяленні № 2 Петрыкава.

У паштальёна чацвёртага разраду з Чалюшчавіч Людмілы Сідарчук — сярэдняя адукацыя, а працоўны стаж яе на гэтай ніве складае 31 год. Яна, як гаворыцца, правафланговы спаборніцтва, бо заўсёды дасягае высокіх вытворчых паказчыкаў. Па выніках мінулага года Людміла Уладзіміраўна занесена на раённую Дошку гонару.

Валянціна Леанідаўна сказала добрыя словы на адрас паштальёнаў аддзяленняў сувязі «Капцэвічы», «Рог» і «Забродзе» Сяргея Саваша, Івана Герасімені і Мікалая Кудраўца, якія прыйшлі ў калектыў з гароднінасушыльнага завода, прадпрыемства меліярацыйных сістэм і раённага спажывецкага таварыства адпаведна. Маючы за плячыма багаты жыццёвы вопыт, яны таксама паказваюць прыклад у працы.

— Наогул, усе нашы паштальёны, — кажа начальнік раённага вузла сувязі, — заўсёды сярод людзей не проста як выканаўцы сваіх абавязкаў, але і як дарадцы. Яны не адмовяцца напісаць пісьмо, параіць, як паводзіць сябе ў той ці іншай сітуацыі, растлумачыць чалавеку сутнасць той ці іншай падзеі.

Апошнім часам, напрыклад, у сувязі з дэнамінацыяй беларускага рубля ім давялося ўдзяляць шмат увагі асобным людзям сталага ўзросту каб патлумачыць адпаведнасць «новых» грошай «старым». Пацікавіліся мы і тым, як праходзіць падпіска на нашу газету. Валянціна Леанідаўна паведаміла, што ў раёне ёсць пастаянныя падпісчыкі «Звязды», якія праяўляюць да яе вялікую цікавасць, бо газета закранае самыя надзённыя пытанні. Невыпадкова, што колькасць чытачоў яе ў трэцім квартале павялічылася.

Зазірнулі мы і ў гарадское паштовае аддзяленне «Петрыкаў-2» і ўбачылі там чаргу людзей, якія разлічваліся за камунальныя і іншыя паслугі, афармлялі падпіску, набывалі тыя ці іншыя тавары, цікавіліся кутком школьніка і г.д. З імі працавалі начальнік аддзялення Алена Юркавец і аператары Настасся Рыбак і Ганна Родзіна. Наведаліся таксама і ў паштовую краму, што насупраць райвузла сувязі. Асартымент харчовых і прамысловых тавараў там на любы густ, а загадчыца Алена Палтаран сказала, што ў канкурэнцыі з іншымі гандлёвымі аб'ектамі раёна крама знаходзіць сваё месца. Выручка за месяц (у «старых») грашах даходзіла да 150—160 мільёнаў. Дарэчы, падобных крамаў у іншых райвузлах сувязі Гомельскага філіяла «Белпошты» няма.

Яшчэ адной адметнасцю прадпрыемства з'яўляецца тое, што ў зімова-вясновы перыяд (са снежня па сакавік), калі паром на Прыпяці стаіць на прыколе, зарэчная зона з шэрагам вёсак ад райцэнтра нібы «адрэзана». Тым не менш жыхары гэтых населеных пунктаў карыстаюцца паштовымі паслугамі ў поўнай меры. Газеты, часопісы, розная карэспандэнцыя і г.д. дастаўляюцца туды праз суседнія Жыткавічы. Жыццё не спыняецца...

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**



Начальнік РВПС Валянціна ЯЎЛАШ *(злева)* разам з аператарам Ганнай РОДЗІНАЙ — самыя першыя чытачы газет.

■ Надвор'е

# Ізноў да плюс 33...

**Канец тыдня чакаецца даволі кантрасным па умовах надвор'я. Калі ў пятніцу і суботу сіноптыкі прагназуюць спякоту, то ў нядзелю надвор'е рэзка пераменіцца. Пра гэта паведамляе Белгідраметэацэнтр.**



Сёння ўмовы надвор'я будзе дыктаваць цёплая паветраная маса, якая будзе да нас паступаць з паўднёвага захаду Еўропы. Чакаецца пераменная воблачнасць, у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Слупкі тэрмометраў падымуцца да адзнакі +25-29 градусаў. Некамфортна будзе ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях — там прыпячэ ажно да плюс 33. Адчуванне спякоты крыху зглядзіць умераны паўднёвы вецер, які падчас навальніц можа ўзмацняцца да парывістага.

Кульмінацыяй чарговай спякотнай хвалі стане субота. Да нас завітае паветра з тропікаў. Тэмпература паветра будзе адпаведная — уначы ад плюс 16 да плюс 21, а на ўсходзе краіны ўдзень зноў чакаецца 33 градусы цяпла. Заходнім раёнам пашанцуе болей — на іх будзе пакрысе насоўвацца актыўны франтальны раздзел з Карпат. Менавіта там і пройдуць навальнічныя дажджы, якія не дадуць паветру прагрэцца больш за 21-26 градусаў.

А ў нядзелю спёка рэзка адыдзе. Сінаптычную сітуацыю будуць вызначаць халаднаватыя паветраныя масы з Балтыйскага мора. Кароткачасовыя дажджы пройдуць на большай частцы тэрыторыі. Уначы паветра астудзіцца да плюс 12-19 градусаў, а ўдзень будзе камфортна — ад 18 да 25 цяпла. Толькі месцамі на Гомельшчыне ртутны слупок можа ўзняцца да плюс 27.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■

# ВЫТВОРЦАМ ПАКАЖУЦЬ ІХ МЕСЦА НА РЫНКУ

**У жніўні пачынаецца гарачая пара для брэндаў. Стартавала народнае галасаванне прэміі спажывецкага прызнання «Народная Марка». Дзякуючы ёй ужо чацвёрты раз вызначацца лідары сярод гандлёвых марак Беларусі. Як адзначыла прадзюсар прэміі Алена УСЦІНОВІЧ, за тры папярэднія гады мерапрыемства дапамагло вытворцам лепш зразумець пажаданні беларускіх спажыўцоў.**

## З кліентам трэба размаўляць

На думку арганізатараў, удзел у галасаванні спажыўцоў дае магчымасць кампаніям атрымаць неабходную зваротную сувязь. Справа ў тым, што анкеты ўтрымліваюць толькі спіс намінацый, без варыянтаў адказу. Назвы гандлёвых марак спажыўцы ўносяць самастойна. А для таго, каб стымуляваць людзей прыняць удзел у галасаванні, арганізатары праводзяць розыгрыш прызавога фонду прэміі — 10 залатых і 100 сярэбраных зліткаў, а таксама 100 квіткоў на ўрачыстую цырымонію ўзнагароджання пераможцаў — канцэртнае шоу «Народная Марка», якое пройдзе 1 снежня з удзелам зорак беларускай эстрады.

Варта адзначыць, што вытворцы прадукцыі, якія ўдзельнічаюць у прэміі, таксама атрымліваюць важныя звесткі ў выглядзе маркетынгавых даследаванняў, дзякуючы якім змогуць выбудоўваць сваю далейшую стратэгію паводзін на рынках. Напрыклад, па інфармацыі арганізатараў прэміі, прыхільнасць беларускага спажыўца да пэўнай гандлёвай маркі з часам захоўваецца ў большасці намінацый. Брэнды-лідары не мяняліся на працягу трох гадоў у 85,71% намінацый харчовых тавараў, 80% — нехарчовых тавараў і 68,75% — паслуг. Большасць беларусаў аддае перавагу таварам беларускіх марак, прычым на працягу трох гадоў назіраецца станоўчая дынаміка: 86%, 92% і 93%.

Калі ўнікнуць у даследаванні крыху глыбей, таксама становіцца зразумелым, што сярод найбольш улюбёных беларусамі гандлёвых марак 85% — брэнды, якія з'явіліся на рынку да 2000 года, 14% — з'явіліся ў 2000—2010 гадах і толькі 1% — пасля 2010 года.

«Аднак ужо цяпер ёсць шэраг актыўных на рынку кампаній, што вырабляюць якасную прадукцыю, якая дазволіла ім за кароткі прамежак часу канкурыраваць з брэндамі-ветэранамі», — заўважыла Алена Усціновіч.

З'яўленне такіх фірмаў стала магчымым дзякуючы актыўнаму выкарыстанню беларускімі прадпрыемствамі тэхналогій прасоўвання сваіх тавараў і паслуг. На думку Алены Усціновіч, канкурэнтаздольнасць шмат у чым залежыць ад маркетынгу і дыялогу са спажыўцом. Вынікі анкет дапамагаюць больш актыўна рэагаваць на пасылы, якія дыктуе час.

Народнае галасаванне сёлета праходзіць у 2 этапы: з 1 па 31 жніўня ў 54 намінацыях харчовых тавараў і з 1 па 30 верасня ў 70 намінацыях нехарчовых тавараў і паслуг. Тыраж анкет, якія размяшчаюцца для галасавання ў друкаваных СМІ, складае больш за 2 млн копій, акрамя таго, вядзецца электроннае галасаванне на сайце прэміі.

## Рэклама ўтрымае бізнес на плаву

**Кансультант Упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Іна ГАЎРЫЛЬЧЫК** падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай старту народнага галасавання прэміі «Народная Марка», адзначыла, што беларускія тавары сёння маюць вялікую патрэбу ў прасоўванні як на ўнутраным, так і на знешнім рынку. Кажучы пра беларускую рэкламу, яна таксама падкрэсліла, што яе якасць расце з года ў год і дазваляе прадукцыі быць больш прыкметнай і хутчэй даходзіць да пакупніка.

«Хацелася б таксама адзначыць, што ў крызісныя часы існуе меркаванне, нібыта трэба скарачаць рэкламныя бюджэты. Аднак, як паказвае практыка, у часы вялікай канкурэнцыі менавіта рэклама «выцягвае» многія прадпрыемствы на добры ўзровень продажаў», — дадала Іна Гаўрыльчык.

Па яе словах, прэмія «Народная Марка» будзе садзейнічаць папулярызацыі беларускіх тавараў, бо па выніках апытанняў вытворцы змогуць зразумець, наколькі запатрабавана іх прадукцыя сярод пакупнікоў.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Валерый БАРАДЗЕНЯ** з самага з'яўлення прэміі ўваходзіць у яе назіральны савет. Ён лічыць, што, нягледзячы на існаванне ў краіне немалой колькасці аналагічных мерапрыемстваў, «Народная Марка» выступае як найбольш аб'ектыўная прэмія спажывецкага прызнання.

«Трэба сказаць, што мы пацэлілі ў самую кропку, калі распрацоўвалі метадалогію падліку вынікаў — бо тая інфармацыя, якая атрымліваецца пасля апрацоўкі анкет, дазваляе беларускім вытворцам зразумець, якое яны займаюць месца ў свядомасці спажыўца. Калі нехта займае значнае месца, то яму лягчэй перажываць любыя змены ў эканоміцы», — адзначыў Валерый Барадзеня.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■ Родная гастраномія

# Тураўская ялавічына, альшанскі агурок

**Каманда журналістаў шукае па краіне найлепшыя прадукты Беларусі, і цяпер гэта было адкрыццё мармуровай ялавічыны (з якой гатуюцца знакамітыя на ўвесь свет стэйкі «Нью-Ёрк» і «Рыбай»), а таксама гародніны з Альшан. Усе знакавыя і смачныя прадукты становяцца часткай унікальнага праекта, які ствараецца, — гастранамічнай карты «Баржомі».**

Наладзіць вытворчасць якаснай ялавічыны ў Беларусі актыўна спрабуюць з 2010 года. Сёння развядзеннем жывёл мясной пароды — абердзін-ангускай, герафордскай, лімузінскай і шаралезскай — у краіне займаюцца 248 прадпрыемстваў. Адзін з удалых прыкладаў — гаспадарка «Тураўшчына» (што на Гомельшчыне), дзе налічваецца 1500 галоў мармуровых бычкоў пароды «Лімузін». На вытворчасці сцвярджаюць, што іх бычкі — адзіныя на нашых прасторах з «чыстай», добрай радаслоўнай. Такая жывёла выдатна пераносіць холад, мае моцны імунітэт (таму іх не колюць антыбіётыкамі), іх мяса — пяшчотнае, мяккае і з пікантным смакам.

«Нашы бычкі ў асноўным ідуць на экспарт, — расказвае дырэктар гаспадаркі «Тураўшчына» Аляксандр КУЗЬМЕНКА. — У апошнія гады мы супрацоўнічалі з Казахстанам, прадавалі туды і жывёлу, і мяса, а ў нашай краіне пакаштаваць мяса можна ў Тураве, у мясцовых рэстаранах. Сёння мы працуем над тым, каб такое было магчыма і ў іншых гарадах. Сёлета будуем апрацоўчы цэх. Але, трэба сказаць, усё будзе залежаць ад гатоўнасці набываць такое мяса па досыць высокім кошце».

Зрабіць стэйкі «Нью-Ёрк» і «Рыбай» можна не толькі з мармуровай ялавічыны, але якасць мяса павінна быць вельмі высокай. Шэф-повар аднаго з мінскіх рэстаранаў кажа, што беларускія рэстараны раней бралі ялавічыну новазеландскую, а пасля перайшлі на бранскую, добрай якасці і больш даступную па кошце.

Экспедыцыя пабывала таксама ў Альшанах (Брэсцкая вобласць), аграгарадку-феномене і агурочнай сталіцы Беларусі. Адной з першых займацца агароднінай тут пачала ферма-перадавік «Альшаны», агародніна якой пастаўляецца ў крамы па ўсёй краіне, а таксама ідзе на экспарт у Расію, Украіну і Польшчу.

«Агародніцтвам у Альшанах пачалі займацца яшчэ ў 1980-я, і сёння штодня на мясцовы рынак пастаўляецца каля 1000 т гуркоў і 150 т памідораў, — кажа ўладальнік фермерскай гаспадаркі «Альшаны» Іван ГРЫБ. — Наша ферма — гэта 260 га зямлі, тры з якіх займаюць цяпліцы з агуркамі і памідорамі, самыя сучасныя, поўнасцю аўтаматызаваныя, вышынёй 7 метраў».

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*


Приорбанк RZB Group

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «К победе с карточкой Приорбанка»

**1. Сведения об Организаторе рекламной игры.**

Организатором рекламной игры является «Приорбанк» ОАО, УНП 100220190, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А

Свидетельство о государственной регистрации выдано Национальным банком Республики Беларусь 12.07.1991 г., регистрационный номер 12, регистрационный номер в ЕГР 100220190.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 12 от 06.05.2013 г.

**2. Наименование рекламной игры.**

Настоящая рекламная игра называется «К победе с карточкой Приорбанка» (далее – рекламная игра).

**3. Место (территория) проведения рекламной игры.**

Республика Беларусь.

**4. Срок начала и окончания рекламной игры.**

С 6 августа 2016 г. по 4 ноября 2016 г. (включая период розыгрыша, вручения Приза и опубликования результатов рекламной игры).

**5. Наименование банковских продуктов (услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра:**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек Visa при совершении безналичных платежей, а также роста уровня эмиссии новых карточек.

**6. Состав комиссии по проведению рекламной игры.**

Председатель комиссии:

Шишов Сергей Иванович, Заместитель Председателя Правления «Приорбанк» ОАО.

Члены комиссии:

Забиран Инна Александровна, директор департамента по работе с частными клиентами «Приорбанк» ОАО;

Лазюк Сергей Сергеевич, директор департамента электронных каналов сопровождения и продаж «Приорбанк» ОАО;

Алымов Никита Юрьевич, начальник отдела карточных продуктов департамента по работе с частными клиентами «Приорбанк» ОАО;

Романчук Алексей Петрович, начальник отдела маркетинга и общественных связей «Приорбанк» ОАО.

Крюковская Татьяна Михайловна, начальник управления УП «Дом Офис 2000».

**7. Состав и размер призового фонда рекламной игры.**

Призовой фонд рекламной игры сформирован за счёт денежных средств и имущества Организатора.

Размер Призового фонда составляет 2 934 (две тысячи девятьсот тридцать четыре) белорусских рублей образца 2009 г. / 29 340 000 (двадцать девять миллионов триста сорок тысяч) белорусских рублей образца 2000 г.

**Призовой фонд включает Призы, указанные в Таблице 1.**

Таблица 1. Призовой фонд.

| Наименование Приза | Кол-во, шт. | Стоимость за ед., бел. руб. образца 2009 г./ бел. руб. образца 2000 г. | Общая стоимость бел. руб. образца 2009 г./ бел. руб. образца 2000 г. |
| --- | --- | --- | --- |
| **Приз I уровня** | | | |
| Велосипед LTD Rocco 30 26"RD MTB Men"14 | 4 | 433,5/4 335 000 | 1734/17 340 000 |
| Денежный приз | 4 | 50/500 000 | 200/2 000 000 |
| **Приз II уровня** | | | |
| Карточка Visa Classic payWave с зачисленной суммой денежных средств | 10 | 100/1000 000 | 1 000/10 000 000 |
| **Итого** | | | 2934/29 340 000 |

**8. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником рекламной игры:**

Участниками рекламной игры являются физические лица – граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет, которые в период с 06.08.2016 г. по 30.09.2016 г. включительно совершили не менее 10 безналичных операций на сумму не менее 30 (300 000) белорусских рублей каждая с использованием банковских платежных карточек Visa Classic, Visa Virtual Account (Internet), Visa Gold, Visa Platinum и Visa Infinite, выпущенных «Приорбанк» ОАО.

Не является основанием для участия в рекламной игре проведение с использованием карточек Visa безналичных операций в учреждениях банков, банкоматах, инфокиосках, отделениях РУП «Белпочта», РУП «Белтелеком», а также с помощью услуг «SMS-банкинг», «М-банкинг», «Интернет-банкинг», автоматизированной информационной системы ЕРИП, перевода денежных средств с карты на карту, операций по погашению кредитов, пополнению депозитов и оплате банковских комиссий.

Участниками рекламной игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, лица, находящиеся с такими лицами в отношениях свойства, а также члены комиссии по проведению рекламной игры.

**9. Место, дата, время и порядок розыгрыша Приза рекламной игры и порядок определения победителей.**

9.1. Розыгрыш Приза состоится открыто в присутствии комиссии в центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А 13 октября 2016 г. в 15.00.

9.2. Порядок проведения розыгрыша Приза рекламной игры (далее – розыгрыш).

К моменту розыгрыша данные об участниках рекламной игры формируются Организатором в список участников. Список участников розыгрыша Приза включает всех физических лиц, которые выполнили условия рекламной игры. Каждому участнику, выполнившему условия рекламной игры, присваивается 5-разрядный индивидуальный номер, соответствующий номеру следования фамилии, имени и отчества в списке по алфавитному порядку, начиная с 00001.

Для проведения розыгрыша используется лототрон и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

За ходом розыгрыша Приза следит комиссия по проведению рекламной игры. Итоги розыгрыша Приза рекламной игры фиксируются в протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

**Порядок проведения розыгрыша.**

Определение выигрышного номера получателя Приза происходит путем его формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера помещаются в барабан шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера участника рекламной игры в списке. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в списке участников и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и извлекается следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в списке участников.

9.3. Итоги розыгрыша фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии. В случае возникновения спорных ситуаций окончательное решение принимает Председатель комиссии по проведению рекламной игры.

9.4 Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в п.7.

**10. Срок и способ информирования победителей. Место, порядок и срок выдачи выигрышей.**

Победитель уведомляется о выигрыше, а также о дате и месте вручения приза по почте по адресу, указанному в заявлении-анкете на предоставление банковской услуги и по номеру телефона, который клиент указал в качестве контактного при заполнении документов на выпуск карточки, не позднее 20 октября 2016 г.

Приз будет выдан в срок до 04 ноября 2016 г., в дату, согласованную с победителем рекламной игры по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А. Победитель рекламной игры должен явиться в офис Организатора с паспортом или другим документом, удостоверяющим личность победителя. Удержание с победителя рекламной игры подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи Приза I уровня из Денежного приза. Призы II уровня выдаются победителям за вычетом подоходного налога.

Выплата денежного эквивалента стоимости Приза или замена его на другой Приз не допускается.

В случае если получатель Приза не явился на вручение приза в установленный срок, приз остается у «Приорбанк» ОАО и используется по своему усмотрению.

Участник рекламной игры, претендующий на получение Приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором.

Участник соглашается давать рекламные интервью об участии в рекламной игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в рекламной игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с тем, что в рамках рекламной игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения рекламной игры.

Все права, в т.ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

**11. Публикация.**

Правила проведения рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала рекламной игры, а также размещению на корпоративном сайте Организатора www.priorbank.by.

Результаты проведения рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» до 04.11.2016 г. включительно, а также размещены на корпоративном сайте Организатора www.priorbank.by.

**12. Контактная информация.**

Телефон для справок в период проведения рекламной игры (017) 289 90 90.

Свидетельство № 2803 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 3 августа 2016 выдано Министерством торговли Республики Беларусь

TV@R

# АД «ТЭЛЕДАХА» ДА «ТЭЛЕВЯРШЫНІ», АД ДЫДЖЭЯ ДА КІРАЎНІКА

## Дзмітрый Дзянісаў лічыць, што любы вопыт, набыты ў жыццi, абавязкова будзе запатрабаваны

**Цыкл перадач «Справы фамільныя», які летась быў паказаны на канале «Беларусь-3», запомніўся многім гледачам. Ён быў прысвечаны вядомым сем'ям са знакавымі для Беларусі прозвішчамі. У свой час менавіта яны стваралі маштабныя мануфактуры, рабілі значны ўнёсак у развіццё айчыннай прамысловасці. Штотыдзень вядучы Дзмітрый Дзянісаў распавядаў пра тое, як развіваліся ў Беларусі шкляная і папяровая прамысловасць, з'явіліся трамваі і банкаўская справа. Мы даведаліся пра першы вопыт электраасвятлення ў Мінску, першы ў краіне цукра-рафінадны завод і многае іншае. Намаганні ўсіх аўтараў (а гэта яшчэ і сцэнарысты Людміла Чарнецкая, Алена Васілюк і Юлія Барысенка) урэшце былі ацэнены. Вядучы Дзмітрый Дзянісаў стаў уладальнікам «Тэлевяршыні» на XII Нацыянальным тэлевізійным конкурсе. «Бронза» ў намінацыі «Лепшы праект рэгіянальнага тэлебачання» за гэтую ж работу таксама дарага каштуе. Дзмітрый Дзянісаў не навічок на тэлебачанні. Ён зараз намеснік дырэктара тэлерадыёкампаніі «Гомель». Кар'еру пачынаў 17 гадоў таму ў якасці дыктара абласнога тэлерадыёаб'яднання. Дарэчы, заўважылі яго не на першым кастынгу. Між тым пра ўсё па парадку і найперш — пра праект «Справы фамільныя».**



— Мы спачатку думалі паказаць на рэспубліканскім канале, як развівалася вытворчасць у Беларусі. Праект планавалі як цыкл, абмежаваны пэўнай тэрыторыяй. Стварылі 13 праграм. Мы цікавіліся гісторыямі найбольш значных родаў. Дарэчы, калі ў Расію цар Пётр Першы спецыялістаў у свой час запрашаў, на Беларусь яны прыязджалі самі: з Польшчы, Расіі, адусюль... І тут наладжвалі вытворчасць. Першыя цукровыя заводы, шклозавод, вытворчасць вырабаў з металу ў нас актыўна развіваліся. Як сёння многія вядомыя фірмы пераносяць вытворчасць у Кітай, каб атрымаць большую маржу з меншай затратнай часткай, так у Беларусь у пазамінулым стагоддзі пераносілі вытворчасць з еўрапейскіх краін, бо гэта было вельмі выгадна. Спрыяльны клімат, працавітыя людзі, выгадныя шляхі перамяшчэння грузаў... Беларускі прадукт ведалі ў той жа Еўропе вельмі добра. Ведаць сваю гісторыю цікава і карысна. Ты развіваешся інтэлектуальна і духоўна, разумееш, як жылі людзі да цябе на гэтай зямлі. І бачыш перспектыву сваёй краіны.

**«Работа ў прамым эфіры дае ўменне імправізаваць. Увогуле радыё — добрая школа, і ў класічным выпадку амаль усе тэлевізійшчыкі праз яго прайшлі».**

***— Ваш асабісты шлях на тэлебачанне не назавеш такім ужо прамым...***

— Мяне заўважылі толькі на трэцім кастынгу. Я ў 1999 годзе заканчваў універсітэт імя Францыска Скарыны, дарэчы, фізічны факультэт. На абласным ТБ спачатку спрабаваў чытаць навіны, а потым разам з Ліляй Вялічка і Сашам Лупіненкам удзельнічаў у маладзёжным праекце пад назвай «Тэледах». Паралельна з гэтым з 2000 года пачаў працаваць выкладчыкам у школе і ўніверсітэце і нават распрацоўваць варыянты кандыдацкай дысертацыі. На кафедры я займаўся камп'ютарным мадэляваннем. Аналагічныя распрацоўкі па камп'ютарным тэсціраванні ляглі ў аснову праграм, якія сёння выкарыстоўвае Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў.

***— Але ж канчаткова на тэлебачанне вы перайшлі толькі ў 2008 годзе. Гэты выбар быў абгрунтаваным?***

— Напэўна. Бо навукай нельга займацца напалову. Таксама нельга напалову займацца эфірам. Прыходзіць момант, калі трэба выбіраць. Але ж такая шматпрофільная дзейнасць дала пэўны вопыт. Цяпер я ўпэўнены, што ў журналістыцы павінны працаваць людзі, якія адбыліся, з жыццёвым вопытам. І неабавязкова яны павінны мець адукацыю журналіста. Канешне, вопыт работы выкладчыкам мне таксама дапамог. Гэта ж работа з аўдыторыяй, лагічна выбудаваны матэрыял, пастаўлены голас... Але ж самае галоўнае — ніколі не спыняцца ў сваім развіцці, быць у пастаянным пошуку. Таму здольнасць да самаадукацыі і цяпер якраз тое, што патрэбна любому журналісту.

***— Дзмітрый, нагадаю, што многія вас памятаюць яшчэ і як папулярнага дыджэя. Гэта быў вядомы трэнд, а цяпер ваш малодшы брат Дзяніс падхапіў эстафету.***

— Так, быў і такі вопыт. Ён мне таксама спатрэбіўся, асабліва, калі я пачынаў працаваць на радыё. У якасці дыджэя я навучыўся ўтрымліваць аўдыторыю. Гэта ж актуальна і цяпер, бо вядзе да высокага рэйтынгу радыё ці тэлепраграм. Любы жыццёвы вопыт ідзе на карысць.

***— Тым больш вопыт работы ў радыёэфіры. Што цікавае ўспамінаеце?***

— У 2008 годзе, калі мы запускалі «Гомель FM», за год радыёстанцыя актыўна развілася — насуперак першай хвалі крызісу. Памятаеце, калі прыйшло тэлебачанне, казалі, што сыдзе радыё. Прыйшоў інтэрнэт, сталі казаць, што сыдуць радыё і тэлебачанне. Насамрэч інтэрнэт — гэта такі мультыінструмент, у які інтэграваліся радыё і тэлебачанне. Сучасныя тэхналогіі радыё — гэта толькі прамы эфір, бо інакш страчваецца аператыўнасць падачы інфармацыі. Тут радыё канкурыруе з інтэрнэт-СМІ. Вядома ж, прамы эфір — гэта больш

**«Сучаснаму вядучаму трэба адначасова сачыць за многім, што адбываецца ў рэжыме прамога эфіру: навіны, рэклама і песні павінны выйсці ў свой час. Трэба перадаць прывітанне, якое прыйшло па sms... І, зразумела ж, пастаянная работа з дыкцыяй».**

таннае вяшчанне. Гадоў 10 таму казалі, што радыё ўжо няма куды развіваць, у адрозненне ад іншых сфер. Але ж радыё таксама пастаянна мяняецца — з эфірнага пераходзіць у інтэрнэт-прастору. Змяняюцца тэхналогіі падачы гуку. Змяняецца методыка падачы матэрыялу. Навіны раней былі аднаго фармату, цяпер — зусім іншага. І гэтыя сучасныя трэнды трэба пастаянна адсочваць і ўлічваць. Той, хто працуе на радыё, атрымлівае навыкі пісьменна пісаць і вымаўляць. Работа ў прамым эфіры дае ўменне імправізаваць. Увогуле радыё — добрая школа, і ў класічным выпадку амаль усе тэлевізійшчыкі праз яго прайшлі. Пасля школы радыё лягчэй працаваць перад тэлекамерай.

***— Дзмітрый, здараліся нейкія кур'ёзы ў радыёэфіры?***

— Калі мы толькі адкрывалі FM-вяшчанне, я тры разы прыязджаў на ранішні эфір да 6 гадзін. І толькі на трэці раз нам тэхнікі далі такую магчымасць. Былі моманты, калі раптоўна выключалася вяшчанне ці давалі збой камп'ютары. Здаралася, што не выключалі своечасова мікрафон. Ёсць слухачы, якія «любяць» вядучых у прамым эфіры. Іншыя, наадварот, нешта цікавае падказваюць.

***— Цяпер, калі за плячыма такая школа напрацовак, вы дакладна ведаеце патрабаванні да тых, хто прыходзіць з марай стаць вядучым радыёэфіру...***

— Звычайна мы даём не вельмі шмат часу, як раней, каб чалавек падрыхтаваўся да выхаду ў эфір. За гэты час трэба навучыцца працаваць пры мікрафоне і асвоіць канкрэтныя камп'ютарныя праграмы. Сучаснаму вядучаму трэба адначасова сачыць за многім, што адбываецца ў рэжыме прамога эфіру: навіны, рэклама і песні павінны выйсці ў свой час. Трэба заўважыць актуальную навіну ў інтэрнэце і агучыць яе або перадаць прывітанне, якое прыйшло па sms... І, зразумела ж, гэта пастаянная работа з дыкцыяй, з логікай падачы матэрыялу.

***— Так здарылася, што вы заняліся яшчэ і адміністрацыйнай работай.***

— Сапраўды, я цяпер у якасці намесніка дырэктара тэлерадыёкампаніі «Гомель» курырую радыё, а таксама мы займаемся стратэгічным планаваннем, у тым ліку і тэлебачання. Думаем пра тое, якія праграмы і праекты могуць быць запатрабаваныя. Займаемся размеркаваннем праектаў у эфіры, іх «пакаваннем». Кіраванне эфірам — гэта самае актуальнае і самае цікавае. Сёння трэба сумяшчаць функцыі кіраўніка і менеджара. Трэба наперад думаць і ведаць, што будзе падабацца гледачу. Напрыклад, сёння людзям цікава даведацца, што адбываецца побач з імі, лакальна. Новыя магчымасці дае нам і інтэрнэт. Могуць з'яўляцца так званыя нішы ў радыёстанцыях, дзе аматары могуць паслухаць джаз ці класіку. Справа ў тым, што FM-эфір дастаткова камерцыйны. І ўсе разумеюць, што радыёстанцыя як прадпрыемства не можа быць стратнай. Таму ўсё завязана на рэкламе. А ў інтэрнэце магчымы розныя варыянты.

***— Наколькі арганічна такі лад жыцця ўспрымае сям'я?***

— Маё колішняе дзіцячае захапленне музыкай перайшло ў прафесійную дзейнасць. Дарэчы, таму спрыяла і мая маці, прафесійны выкладчык музыкі, якая сёння імкнецца перадаць сваю любоў да музыкі маёй старэйшай дачцэ Дашы. Тое, што падабаецца мне, слухае і глядзіць мая сям'я. З жонкай Нінай мы знаёмы вельмі даўно і ў нас захаваліся агульныя інтарэсы, хоць яна і медык па адукацыі. Наадварот цікава, што розныя людзі столькі гадоў знаходзяць кропкі для сутыкнення. На мерапрыемствы мы заўсёды ходзім разам. Бывае, што мяне сваякі нават крытыкуюць, і я імкнуся прыслухоўвацца да іх парад. Маша яшчэ зусім маленькая, а Даша нядаўна дапамагала мне на здымках праграмы «Мой край», якую мы робім для тэлеканала «Беларусь-3». Яна трымала рэквізіт, прыносіла бутэлькі з вадой. Ёй было ўсё вельмі цікава. Але ж да таго часу, як яна будзе вырашаць, ці патрэбна ёй гэта прафесійна, тэлебачанне значна зменіцца. Пажывём — пабачым.

**«Вопыт работы выкладчыкам мне дапамог. Гэта ж работа з аўдыторыяй, лагічна выбудаваны матэрыял, пастаўлены голас...»**

***— Як бы вы сфармулявалі сваё крэда?***

— Дробязяў пры стварэнні якаснага радыё- і тэлепрадукту не бывае. Таму важна зрабіць усё максімальна якасна. Трэба прадумаць усё, каб і самому адчуваць задавальненне ад таго, што бачыш ці слухаеш у эфіры.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## Субота, 13 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.10** Існасць.
**6.35 Камедыя «Саламяны капялюшык».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50, 12.10, 21.40** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Дзённік.
**9.55 Серыял «Сваты-5».**
**11.05** 50 рэцэптаў першага.
**12.15** Дача.
**12.55, 15.45 Дэтэктыў «Пірат і Піратка».**
**15.15** Краіна.
**21.00** Панарама.
**22.05 Меладрама «Абмяняйцеся пярсцёнкамі».**
**23.55 Камедыя «Нявеста любой цаной».**
**1.40** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05, 0.15** Тэлебарометр.
**7.10 Серыял «Класная школа».**
**8.10** Занадта шмат хвастоў.
**8.50 Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».**
**11.00 Серыял «Хто ў доме гаспадар?» Заключныя серыі.**
**12.35** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
**13.35** Капейка ў капейку.
**14.15 Камедыя «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі».**
**16.20** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Мужчыны. Славенія — Германія.
**17.00** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Валейбол. Мужчыны. Іран — Егіпет.
**18.10** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Баскетбол. Жанчыны. Беларусь — Аўстралія.
**20.00, 21.55** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Футбол. Мужчыны. 1/4 фіналу.
**21.50** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.55** Кіпень.

### Беларусь 3

**7.45, 13.15, 16.05, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.00, 16.20 «Калачы». Камедыя.**
**9.25** «Легенды беларускай эстрады». Надзея Мікуліч «Дзяўчына з гітарай».
**9.50** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-1993».
**10.45 «І ты ўбачыш неба». Драма 1978.**
**11.45** «Партызаны супраць Вермахта». Дак. серыял. 3—4-я серыі.
**12.40** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.30** «Час кіно».
**13.40 «Дрэва жадання». Драма.**
**15.20, 21.15** «Засакрэчанае каханне. Каханне пад кантролем». Дак. фільм.
**17.40** «Навукаманія».
**18.10 «Не бойся, я з табою!» Камедыя.**
**20.40** «Калыханка».
**22.00 «Кахаць па-руску-2». Меладрама.**
**23.30** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**5.30, 15.25** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Дзённік.
**5.55** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Баскетбол. Мужчыны. ЗША — Сербія.
**7.35** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Гандбол. Жанчыны. Расія — Аргенціна.
**9.15** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Валейбол. Жанчыны. Бразілія — Паўднёвая Карэя.
**11.05** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Агляд дня.
**15.30** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Лёгкая атлетыка. Веславанне акадэмічнае.
**18.50** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Бокс.
**20.00** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Тэніс. Фіналы. Скачкі на батуце. Мужчыны. Фінал.
**22.10** PRO спорт. Навіны. Рыа-2016.
**22.15** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Веласпорт. Трэк. Бокс.
**1.00** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Цяжкая атлетыка. Мужчыны. 94 кг.
**2.40** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Лёгкая атлетыка. Плаванне. Фіналы.
**5.20** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Пляжны валейбол.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Дачныя феі».
**12.35 Камедыя «Оптам танней».**
**14.15 Камедыя «Оптам танней 2».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Фідэль Кастра. «Куба — любоў мая!»
**17.20** «Удача ў прыдачу! З «Еўраопт».
**18.00** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**18.55** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.35** Музычны фестываль «Рок за Баброў». Канцэрт рок-гурта «Вопли Видоплясова».
**23.40 Камедыя «Агент 117: Місія ў Рыа».**

### СТБ

**6.10 «Турысты». Серыял.**
**7.40** «Анфас».
**7.55 Камедыя «Прачнуўшыся ў Рына».**
**9.30** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.05** «Ежа багоў».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Далёкія сваякі».
**11.45 «Салдаты 12». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 2.00 Маст. фільм «Месяц жніўень».**
**15.00** «Самая карысная праграма».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.35** «Прагнасць».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Нам і не снілася».
**22.40 «Насланнё». Серыял. Заключныя серыі.**

### МІР

**6.00, 4.40** М/ф.
**8.30** Медыцынская праўда.
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45, 1.35 Маст. фільм «Дзеці Дон-Кіхота».**
**12.15** «Цяжар абеду».
**12.45 Маст. фільм «Анёл».**
**15.30** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.15 Серыял «Гаражы».**
**23.50 Маст. фільм «Прадчуванне».**
**3.05 Маст. фільм «Цырк».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Школа пражывання».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Правілы руху».
**12.25 Маст. фільм «Крок насустрач».**
**14.15** «Мая планета».
**14.50 Маст. фільм «Лясное возера».**
**16.30 Маст. фільм «Удар задыяка».**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.35 Маст. фільм «Познія кветкі».**
**23.50** «Танкавы біятлон».
**1.10** «Асабістае. Дзмітрый Дзюжаў».

### НТВ—Беларусь

**5.50** «Астрапрагноз».
**5.55, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.45** Іх норавы.
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.10** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.10** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Удача ў прыдачу!»
**14.15, 16.20 Серыял «Адысея сышчыка Гурава».**
**18.10** «Следства вялі...»
**19.20** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.10 Серыял «Пёс».**
**22.50** «Суперстар» прадстаўляе: «Эпоха застолля».

### 8 канал

**9.00, 15.45, 19.55, 21.10, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.50 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**10.40** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**10.50, 15.50, 19.00, 20.55** «Хатняя крама».
**11.05 Серыял «На дарозе».**
**14.35** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**17.30, 19.10, 20.00 Серыял «Флемінг».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Драма «Падмена».**

### ВТБ

**6.00, 7.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**8.00, 13.30, 23.00, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**8.45** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.30, 12.00** «Ералаш».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.30, 23.30** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**14.00** «Кіно ў дэталях».
**15.00** Камедыя «Дабл трабл».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**18.30** Серыял «Апошні з Магікян 3».
**20.30** Баявік «Сахара».
**0.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».
**4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «Каін XVIII». Маст. фільм.
**12.05** «Рына Зялёная — імя ўласнае».
**12.45** «Факультэт непатрэбных рэчаў». «Чалавек дажджу».
**13.15** «Дэльта, якая дорыць жыццё». Дак. фільм.
**14.10** І Міжнародны Далёкаўсходні фестываль «Марыінскі». Акіко Суванаі, Валерый Гергіеў і Сімфанічны аркестр Марыінскага тэатра.
**15.40** «Не бядуй!» Маст. фільм.
**17.10** «Тыя, з якімі я... Георгій Данелія».
**18.05, 1.55** Па слядах тайны. «Чалавек эпохі дыназаўраў».
**18.50** «Алег Барысаў». Дак. фільм.
**19.30** «За двума зайцамі». Маст. фільм.
**20.45** Шлягеры XX стагоддзя. Уладзімір Васільеў, Святлана Бязродная, Дзмітрый Назараў, Уладзімір Зельдзін, Вера Васільева і Расійскі дзяржаўны акадэмічны камерны «Вівальдзі-аркестр» у канцэрце «Знесеныя ветрам».
**22.15** Новае расійскае кіно. «Папяровы салдат». Маст. фільм.
**0.15** «Кніга джунгляў. Мядзведзь Балу». Дак. фільм.
**1.05** Легенды свінга. Валерый Кісялёў і Ансамбль класічнага джаза.
**1.40** «Мена». М/ф для дарослых.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Юрый Малікаў. 2008 год.
**6.50, 8.15, 9.40, 11.00, 13.50, 15.40, 19.25, 20.30, 21.40, 23.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10, 1.10** Маст. фільм «Прыгоды Пятрова і Васечкіна».
**8.35** Канцэрт «Спявае ВІА «Синяя птица». 1979 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Народжаны ў СССР». Прафесар Лебядзінскі. 2008 год.
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1961. 2-я частка. 2011 год.
**13.05** «Тэатральны раман» з Эдвардам Радзінскім: «Маскоўскія тэатры ў 60-я гады...» 1-я частка.
**14.10** «Кінапанарама». «Юбілейны выпуск. 20 гадоў». 1982 год. 2-я частка. 1982 год.
**16.00** Фільм-спектакль «Варшаўская мелодыя». Паводле п'есы Л. Зорына. 1969 год.
**18.00** Фільм-канцэрт «Адліга». Юрый Шаўчук і гурт «ДДТ». 1988 год.
**19.00** «Час пік» з Дзмітрыем Кісялёвым. Юрый Шаўчук. 1996 год.
**19.50** «Тэма» з У. Лісцьевым: «Свабоднае каханне». 1992 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Жыве такі хлопец».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. Вераніка Доліна. 2005 год.
**2.15** «Рок-урок». 1993 год.
**4.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Алёна Свірыдава і Ліка Стар. 2008 год.

### EuroSport 1

**3.00, 7.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Найлепшае.
**4.00, 23.05** Watts.
**6.00, 18.00** «Яго вялікасць футбол».
**8.00, 20.15** Снукер. China Open. Фінал.
**9.30, 15.05, 20.00, 21.30, 22.55, 0.00** «Дарога да золата».
**9.35, 11.45, 0.05, 1.45** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**12.30, 14.00, 15.10, 21.35** Веласпорт. Арктычная гонка Нарвегіі.
**19.00** Веласпорт. Amstel Gold Race.

### Камедыя

**0.35** «Сардэчна запрашаем у джунглі». Прыгоды.
**2.15** «Штосьці падобнае на шчасце». Камедыя.
**3.55** «Спачатку каханне, потым вяселле». Меладрама.
**5.35** «Кекс у вялікім горадзе». Камедыя.
**7.15** «Удачы, Чак». Меладрама.
**9.00** «12 калядных жаданняў». Камедыя.
**10.35** «Дыска». Камедыя.
**12.25** «Высокі бландзін у чорным чаравіку». Камедыя.
**14.10** «Я, тата і сабака». Камедыя.
**16.00** «Вялікае вяселле». Камедыя.
**17.35** «Гуляй, як Бэкхэм». Меладрама.
**19.30** «Разумнікі». Драма.
**21.10** «Шайбу! Шайбу!» Камедыя.
**22.45** «Сэрца воіна». Драма.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.15** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.10** «Доказ віны».
**11.45, 1.10** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.15** М/ф «Сезон паляванне 2».
**16.25** «Блокбастары».
**17.25, 4.10** «Алігарх ТБ».
**17.55** «Хэлоў, Раша».
**18.55** «Карасі». Меладрама.
**21.00** «Каўбоі супраць прышэльцаў». Фантастыка.
**23.10** «Каліфрэнія». Серыял.
**23.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.35** «Масфільм. Фабрыка савецкіх мрояў».

### ТБ1000

**6.10, 18.25** Камедыя «З 5 да 7. Час палюбоўнікаў».
**8.10, 4.20** Вестэрн «Цёмная даліна».
**10.10** Драма «Прабліск геніяльнасці».
**12.15, 2.30** Баявік «Турыст».
**14.10** Прыгоды «Каратэ-хлапчук».
**16.35** Меладрама «Штосьці новенькае».
**20.10** М/ф «Труп нявесты».
**22.00** Фантастыка «Гатака».
**0.10** Драма «Чорны ястраб».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 15.05** Трагікамедыя «Апошні забой».
**8.10, 2.30** Меладрама «Благаславіце жанчыну».
**10.20, 4.40** Меладрама «Домік у сэрцы».
**12.10** Драма «Алеся».
**13.40** Драма «Паляванне на аднарога».
**16.45** Драма «Мора».
**18.15** Драма «Крома».
**20.20** Камедыя «Даўн Хаус».
**22.10** Драма «Час пік».
**0.10** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».

### National Geographic

**6.00, 8.00, 13.00** Гульні розуму.
**6.00, 13.50, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**11.20** Незвычайныя промыслы.
**12.10, 23.30, 2.50** Расследаванні авіякатастроф.
**14.35** 90-я. Найвялікшыя футбольныя моманты.
**15.25** 90-я. Дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**19.25, 1.10, 3.40** Космас. Прастора і час.
**20.10** «Тытанік»: заключнае слова.
**21.45, 2.00, 4.30** Асушыць акіян.
**22.34** Зорная размова. Біл Клінтан.
**0.20** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00, 0.00** Смяротны ўлоў.
**10.00** Амерыканскі Тарзан.
**11.00, 4.40** Паляўнічыя на склады.
**12.00** Іржавая імперыя.
**13.00** Бітвы за кантэйнеры.
**14.00** Махінатары.
**15.00, 2.55, 6.20** У пагоні за класікай.
**16.00, 5.30** Таргі без тармазоў.
**17.00** Чаму? Пытанні светабудовы.
**18.00, 21.00** Правілы пазадарожнага руху.
**19.00** Раз'юшаная планета.
**20.00** Выжыць разам.
**22.00** Інжынерыя немагчымага.
**23.00** Мегаперавозкі.
**2.00** Выжыванне без купюр.
**3.50** Чарнобыль: жыццё пасля.
**7.10** Бягом па Брытаніі.

## Не першы погляд

# А ПА ВАС І НЕ СКАЖАШ...

**Аб заходніх знакамітых акцёрах і прадстаўніках шоу-бізнесу вельмі часта мяркуюць па іх ролях у кіно і паводзінах у грамадстве, часта не вельмі станоўчых і культурных, але на самай справе не ўсё так проста. Не заўсёды, так бы мовіць, знешнія фактары знаходзяць пацвярджэнне ва ўнутраным свеце. На ніжэй паказаных знакамітасцях дакладна не скажаш, што яны дамагліся нейкіх значных поспехаў у адукацыі і навуцы, і тым не менш яны сапраўды разумнейшыя, чым здаюцца.**



**Наталі Портман.** У 1998 годзе, падчас вучобы ў сярэдняй школе, актрыса стала суаўтарам даследчай работы на тэму «ферментацыйная выпрацоўка вадароду», якая дала ёй магчымасць удзельнічаць у навуковых спаборніцтвах Intel, дзе яна дайшла да паўфіналу. Портман нават прапусціла прэм'еру фільма «Зорныя войны. Эпізод І», у якім сыграла адну з галоўных роляў, каб падрыхтавацца да выпускных іспытаў. У чэрвені 2003 года Наталі стала выпускніцай Гарварда, атрымаўшы ступень бакалаўра ў галіне псіхалогіі.

**Роўэн Аткінсан.** Вядома ж, смешны і прыдуркаваты Містар Бін — не больш чым экранны вобраз. Але гледзячы на самога Роўэна Аткінсана цяжка паверыць, што ён з'яўляецца дыпламаваным інжынерам — магістрам электратэхнікі. Гэтую ступень ён атрымаў у Ньюкаслскім універсітэце.

**Браян Мэй.** Брытанскі рок-музыкант, найбольш вядомы як гітарыст гурта «Queen» і аўтар шматлікіх хітоў гэтай групы. Але акрамя ўсяго гэтага, ён з'яўляецца яшчэ і навукоўцам-астрафізікам. Браян падрыхтаваў дысертацыю на атрыманне ступені доктара філасофіі па астранамічных даследаваннях у інфрачырвоным дыяпазоне і мае дзве навуковыя публікацыі па астраноміі, калі поспех «Queen» прымусіў яго перапыніць навуковую кар'еру.

**Дэвід Духоўны.** Да таго, як будучы «агент Малдэр» захапіўся тэатрам і акцёрствам, ён паспяхова адвучыўся ў аспірантуры Ельскага ўніверсітэта, дзе стаў магістрам англійскай літаратуры і ўжо рыхтаваўся абараніць дысертацыю на ступень доктара філасофіі па тэме «Магія і тэхналогія ў сучаснай паэзіі і прозе».

**Сіндзі Кроўфард.** Амерыканская супермадэль, актрыса і вядучая MTV. Наогул, лічыцца, што дзяўчыны-мадэлі не вызначаюцца розумам і адукацыяй. Але Сіндзі скончыла старэйшую школу з высокімі баламі і атрымала акадэмічную стыпендыю ў Паўночна-заходнім універсітэце, дзе вывучала хімічную тэхналогію. Аднак пасля першай чвэрці Сіндзі кінула вучобу, каб засяродзіцца на кар'еры мадэлі.

**Дольф Лундгрэн.** Яго знешнасць вялізнага, грубага салдата ніяк не вяжацца з наяўнасцю вострага розуму. А між тым Лундгрэн атрымаў ступень магістра хімічнага машынабудавання ў Сіднейскім універсітэце, а таксама стаў стыпендыятам праграмы Фулбрайта Масачусецкага тэхналагічнага інстытута

■ Весткі з Кітая

# ПЕРАКЛАДЧЫКУ ПАТРЭБНЫЯ НАТХНЕННЕ І СМЕЛАСЦЬ



**Мар'яна САЎЧАНКА — малады перакладчык кітайскай літаратуры на ўкраінскую мову. З ёю сустрэўся наш карэспандэнт і задаў некалькі пытанняў пра яе творчыя зацікаўленні, пра тое, як успрымаецца кітайская літаратура ва Украіне. Якія ўвогуле перспектывы развіцця ўкраінскай кітаістыкі. Ці ёсць масавы чытач у кітайскай прозы ва Украіне. І вось што пачуў у адказ...**

***— Мар'яна, вы звярнулі ўвагу на Мо Яня яшчэ да таго, як яго мастацкія вышукі былі адзначаны Нобелеўскай прэміяй?***

— Імя Мо Яня было мне вядома дзякуючы фільму Чжана Імоу «Чырвоны гаалян», які зняты па матывах аднайменнага рамана. Аднак блізка з яго творчасцю я знаёмая не была. Па праўдзе кажучы, Мо Янь да атрымання Нобелеўскай прэміі не ўваходзіў у лік так званых абавязковых да прачытання пісьменнікаў, паколькі кітайскія інтэлектуалы не лічаць яго мастацкі стыль дастаткова ўзвышаным.

***— «Краіна віна» — раман, з якога фактычна пачалося ўзыходжанне Мо Яня да рускага чытача... А ўкраінская гісторыя знаёмства з Мо Янем — з чаго яна пачалася?***

— Першым раманам Мо Яня, перакладзеным на ўкраінскую мову, стаў усё той самы «Чырвоны гаалян: гісторыя аднаго роду» — праца Надзеі Кірносавай, які выйшаў у 2015 годзе, на некалькі месяцаў раней, чым пераклад рамана «Краіна віна»...

***— Наколькі складана было перакладаць «Краіну віна»? Ці шмат у рамане выключна кітайскай спецыфікі, якую нельга даслоўна перакласці на іншыя мовы?***

— Безумоўна, складанасць перакладу ў першую чаргу заключаецца менавіта ў перадачы кітайскіх рэалій і культурна-літаратурных алюзій, якімі напоўнена простая на першы погляд мова Мо Яня. Я пастаралася ўнесці як мага болей тлумачэнняў для ўкраінскага чытача, у перакладзе данесці інтэртэкстуальнасць і шматграннасць рамана нават да тых, хто судакранаецца з кітайскай рэчаіснасцю ўпершыню.

Адным з прыкладаў стылістычных асаблівасцяў, і гэта, на жаль, прыкмета страчана пры перакладзе, з'яўляецца частковае выкарыстанне класічнай мовы веньянь. Аналагам магла б быць стараўкраінская мова, але ў такім разе ахвярай зрабіўся б змест, паколькі наўрад ці быў бы ён зразумелы большасці чытачоў. Адпаведна, пры перакладзе падобных фрагментаў давялося б шукаць спосабы захаваць арыгінальную задумку і надаць словаформам адценне архаічнасці.

Яшчэ адной няпростай задачай стала праблема вызначэння тэрміналогіі спіртных напояў. Слова «цзю» ў кітайскай мове ахоплівае даволі шырокі клас моцнай алкагольнай прадукцыі, аднак у савецкай перакладчыцкай традыцыі кітайскай літаратуры, і найперш паэзіі, яго прынята перакладаць як «віно», што даволі істотна звужае рамкі тэрміна. Але і тэрмін «водка»...

***— Па-беларуску — гарэлка... Ды і па-ўкраінску таксама «гарэлка»...***

— Дык вось тэрмін «гарэлка» не з'яўляецца абсалютна дакладным для вызначэння напою, якія атрымліваюць з гааляна і рысу. А героі Мо Яня якраз іх і ўжываюць... у немалой колькасці. Адным словам, «Краіна віна» застаецца назвай выключна паэтычнай, а на самай справе дзеянне рамана адбываецца ў прыдуманым горадзе з назвай «Алкагольная краіна» («Цзюго»).

***— Наклад рамана Мо Яня «Краіна віна» на ўкраінскай мове не дужа высокі — 500 асобнікаў... Наколькі хутка раман разышоўся ў кніжным гандлі? Ці былі рэцэнзіі, водгукі ў друку, у самых розных медыя?***

— Я не сачу за продажам і рэцэнзіямі. Мне была выключна цікавай сама гэтая праца, але найболей важкім з'яўляецца тое, што раман усё ж такі выйшаў, нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, і цяпер яго можна знайсці ў кнігарнях і бібліятэках.

***— А ўвогуле, наколькі шырока сёння прадстаўлена проза Мо Яня на ўкраінскай мове?***

— Наколькі мне вядома, акрамя двух ужо згаданых раманаў і апавядання «Геній» (надрукаванага раней у літаратурным часопісе «Усесвіт»), іншыя пераклады Мо Яня на ўкраінскую мову не былі надрукаваны.

***— Вы — адзін з нямногіх перакладчыкаў кітайскай літаратуры, хто перакладае на ўкраінскую з мовы арыгінала... Але ж быў і іншы вопыт. У канцы 1940-х — 1950-я гады здарыўся бум перакладу кітайскай літаратуры на ўкраінскую мову. І такое ж назіралася ў Беларусі. Вы ведаеце тыя ўкраінскія пераклады? Яны нешта значаць для вас як для чытача і даследчыка, перакладчыка?***

— Я — выпускніца Кіеўскай гімназіі ўсходніх моў №1, навучальнай установы, якая беражліва захоўвае і прывівае сваім выхаванцам традыцыі ўкраінскага ўсходазнаўства. Зразумела, у дзяцінстве, калі ўзровень кітайскай яшчэ не дазваляў чытаць арыгінал, наша знаёмства з кітайскай літаратурай і пачалося з перакладаў, ажыццёўленых у савецкую эпоху, — твораў Лу Сіня, Маа Дуня, Лаа Шэ, Ба Цзіня... Асаблівае месца сярод іх займалі работы Івана Карнеевіча Чырко, чый уклад нязменна застаецца прыкладам для айчынных кітаістаў-перакладчыкаў. І мае ўласныя першыя крокі ў мастацкім перакладзе пачаліся ўжо ў старшых класах школы, праўда, аб'ектам маіх спроб была не проза, а танская і сунская паэзія.



Беларуская перакладчыца кітайскай літаратуры Дар'я НЕЧЫПАРУК з вядомым мастаком, вучоным і літаратарам Кітая Гао Манам.

***— Над чым вы цяпер працуеце? Якія раманы Мо Яня вам хацелася б перакласці ў першую чаргу?***

— Мне цікавая творчасць больш малады кітайскіх пісьменнікаў, маіх сучаснікаў, якія працуюць у эпоху, якую я назіраю і якую перажываю ў Кітаі сама. Акрамя таго, значная частка маёй дзейнасці звязана з тэатрам, таму ў гэты момант мая цікавасць як перакладчыка скіравана на драматургію. Менавіта сучасная драматургія... Цяпер я працую над перакладам дзвюх п'ес Ляо Імэй — надзвычай вядомай і даволі таленавітай пісьменніцы, драматурга, сцэнарыста...

***— Будзем спадзявацца, што знаёмства з кітайскім тэатральным мастацтвам, кітайскай драматургіяй будзе ўплываць і на свядомасць украінскіх чытачоў, а не толькі гледачоў... Ці ёсць усё ж такі зацікаўленасць украінскіх выдаўцоў у выпуску ў цэлым кітайскай літаратуры на ўкраінскай мове?***

— На вялікі жаль, зацікаўленасць надзвычай нізкая, як і цікавасць да кітайскай літаратуры ва Украіне ўвогуле. Дзякуючы перакладам на рускую мову, у чытачоў сфарміраваны пэўны вобраз кітайскай класічнай літаратуры, якая выклікае абмежаваны інтарэс, і, магчыма, у некаторай ступені існуе ўяўленне пра новую літаратуру. Што датычыць перакладаў найноўшай літаратуры, асабліва тых, што выйшлі ў якасці самастойных выданняў, — іх колькасць да неверагоднага малая. Прысуджэнне Мо Яню Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры паслужыла ўсяго толькі невялічкім штуршком для выдаўцоў, але ўвогуле сітуацыя даволі ўпадніцкая. Верагодна, аддаленасць нашых дзяржаў і культур, а таксама няздольнасць меркаваць пра якасць літаратуры на экзатычнай мове абмяжоўвае попыт. Мне вельмі хацелася б звярнуць увагу украінскіх выдаўцоў на работу заходніх калег...

***— Як, напрыклад, у Сербіі, дзе пабачылі свет ці не дзясятак асобных выданняў твораў Мо Яня...***

— Бо там не ігнаруюць сучасных кітайскіх аўтараў. Іх рэгулярныя публікацыі перакладаў і рэцэнзій на англійскай мове маглі б паслужыць арыенцірам у выбары твораў для айчынных выдаўцоў.

***— У Беларусі не выдадзена ніводнай кнігі, ніводнага рамана Мо Яня па-беларуску... Што б вы пажадалі сваім беларускім калегам на шляху засваення творчасці Мо Яня? З якога рамана варта пачаць беларускім перакладчыкам?***

— Мне здаецца, што выбар перакладчыка — пытанне выключна асабістага літаратурнага густу і прафесійнага інтарэсу, таму складана штосьці раіць. Найбольш знакавымі творамі для знаёмства з напісаным Мо Янем, пэўна, з'яўляюцца раманы «Вялікія грудзі, шырокі зад» і «Чырвоны гаалян», але для лепшага разумення кітайскага грамадства нельга, на мой погляд, абысці ўвагай і «Краіну віна», і «Лягушку». Беларускім калегам хацелася б пажадаць пабольш натхнення і смеласці, бо, нягледзячы на сваю багатую фантазію, Мо Янь піша пра перажытае, і характары дастаткова ўніверсальныя і блізкія многім народам, а яго іранічная ўсмешка дазваляе разглядзець не толькі кітайцаў, але і на саміх сябе зірнуць крышачку інакш.

**Гутарыў Кастусь ЛАДУЦЬКА.**
*Пекін — Мінск*

■ Напярэдадні падзеі

## СЛОВА СКАРЫНЫ ЯДНАЕ

**Набліжаецца Дзень беларускага пісьменства. Сёлета ён, як вядома, пройдзе ў Рагачове — у горадзе, старонцы, з якой паяднаны лёсы славутых пісьменнікаў Уладзіміра Караткевіча, Андрэя Макаёнка, Міколы Купрэева і шмат яшчэ каго з кагорты паэтаў, празаікаў, публіцыстаў.**

Напярэдадні Дня беларускага пісьменства па традыцыі пройдзе міжнародны «круглы стол» з удзелам літаратараў з розных куточкаў свету. Гэтым разам у Беларусь прыедуць пісьменнікі з Азербайджана, Вялікабрытаніі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Расіі, Сербіі, Славакіі, Таджыкістана, Украіны, Чарнагорыі. Пісьменнікі абмяркуюць надзённыя клопаты, звязаныя з развіццём нацыянальных літаратур, кнігадрукавання. Святлом, якое скіравана на характар мяркуемых дыскусій, з'яўляецца сама тэма сустрэчы — «Сугучча: слова Скарыны ў сучасным свеце».

Нагадаем, што дзясяты год запар міжнародны круглы стол літаратараў праводзіцца па ініцыятыве Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Сярод арганізатараў — Саюз пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкі дом «Звязда».

**Сяргей ШЫЧКО**

## ЗА КРОК ДА СТАРТУ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Алімпіяда-2016 пройдзе пад ***дэвізам*** «Мы ўсе — Бразілія». Рашэнне аб выбары такога слогана прыняла асабіста прэзідэнт краіны Дылма Русеф. Афіцыйным гімнам Гульняў стала мелодыя ў рытме самба — «Богі Алімпа едуць у Рыа-дэ-Жанэйра». Выканаюць песню бразільскія зоркі шоу-бізнесу.

***Лагатып*** XXXI летніх Алімпійскіх гульняў распрацаваны бразільскай дызайнерскай студыяй Tatil Design і ўпершыню быў прадстаўлены шырокай публіцы 31 снежня 2010 года. У аснове знака — стылізаваны Рыа: горы, сонца і мора ў выглядзе звілістых ліній, якія нагадваюць сілуэты людзей, якія танцуюць і ўзяліся за рукі. Лагатып выкананы ў колерах нацыянальнага сцяга краіны-гаспадыні — сінім, жоўтым і зялёным, ён закліканы сімвалізаваць узаемадзеянне і энергію, гармонію ў разнастайнасці, буянства прыроды і алімпійскі дух.

***Талісманамі*** турніру сталі Вінісіўс і Том. Іх імёны былі вызначаны ў выніку трохтыднёвага інтэрнэт-галасавання, у якім увогуле прыняло ўдзел больш за 300 тысяч чалавек. Талісманы — зборныя вобразы жывёльнага і расліннага свету Бразіліі. Вінісіўс намаляваны ў выглядзе ўсмешлівага жоўтага звера і нагадвае ката, ён сімвалізуе багатую фаўну Бразіліі. Том выкананы ў сініх і зялёных колерах і ўвасабляе флору.

Арганізатары адзначаюць, што цырымонія адкрыцця Алімпійскіх гульняў 2016 года ў Рыа-дэ-Жанэйра не будзе дарагой і маштабнай, як на папярэдніх летніх Алімпіядах. Тут не будзе грандыёзнасці Пекіна, велізарных спецэфектаў Афін, эксцэнтрычнасці і тэхналагічнасці Лондана. Гэта будзе простая, але вельмі сучасная цырымонія, пры гэтым нават без спецэфектаў яна будзе гаварыць людзям пра будучыню.

Убачыць грандыёзнае шоу можна ў прамым эфіры на тэлеканале «Беларусь 1» — пачатак трансляцыі ў суботу ў 01.15.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 2 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), обшей площадью 235,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 422080407101000085, площадь 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина), расположен по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18 |
| Начальная цена продажи | 76 500 р. (семьдесят шесть тысяч пятьсот рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 7 650 р. (семь тысяч шестьсот пятьдесят рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 19 августа 2016 г. в 15.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.06.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 15 августа 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

## Извещение о повторном аукционе 17 августа 2016 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| | | |
|---|---|---|
| **Наименование объекта** | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций» |
| **Номер лота** | 1 | 2 |
| **Местонахождение объекта** | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2 |
| **Тип помещения** | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением |
| **Общая площадь (кв.м)** | 3982,2 | 4516,7 |
| **Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)** | 1,444 | |
| **Начальная цена продажи** | 236 375 руб. 89 коп. | 267 967 руб. 31 коп. |
| **Сумма задатка** | 23 638 руб. | 26 797 руб. |
| **Условия продажи** | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв.м), решение об отводе земельного участка** | Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г. | Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г. |
| **Организатор аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | |
| **Продавец аукциона** | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» | |

**Аукцион состоится 17 августа 2016 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале**.

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет 3012470120029 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление код 401, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – **по 16 августа 2016 г. включительно.**

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10-ти рабочих дней со дня проведения аукциона

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 16 августа 2016 года включительно, тел. 80165-37-16-07, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактные телефоны: 375-29-674-55-42, 375-29-640-80-37.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОДАЖЕ АКЦИЙ

